Смолік А.І.,
прафесар

# АСЭНСАВАННЕ ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ ТРАГЕДЫІ Ў ВЫЯЎЛЕНЧЫМ МАСТАЦТВЕ

Аварыя на Чарнобыльскай АЭС высвеціла шэраг сур'ёзных праблем у жыццядзейнасці грамадства. Перад ім паўстала задача пераадолення экалагічнага крызісу, звязанага з катастрафічнымі вынікамі чалавечай дзейнасці. Уздзеянне чалавека па сваіх наступствах можна цяпер параўнаць толькі з самымі грознымі сіламі прыроды. Па маштабах і магчымых наступствах для насельніцтва і навакольнага асяроддзя з яго экасістэмамі, а таксама для эканомікі краіны аварыя на Чарнобыльскай АЭС аказалася самай маштабнай і цяжкай за ўсю сусветную гісторыю выкарыстання атамнай энергіі.

Аналіз мастацкіх твораў, прысвечаных наступствам чарнобыльскай катастрофы, сведчыць: адны творцы формай імкнуліся зменшыць жудасны змест бяды, эстэтызаваць загану, а другія, наадварот, з дапамогай выразнай мастацкай мовы (формы) адчувальна выяўлялі сутнасць трагедыі беларускага народа, вымушалі чалавека здрыгануцца ад убачанага. Ва ўмовах наўмыснага замоўчвання афіцыйнай уладай маштабаў катастрофы і дэзінфармацыі насельніцтва аб магчымым уплыве радыяцыі на здароўе людзей, недастатковых канкрэтных дзеянняў адпаведных органаў і медыцынскай службы мастакі ва ўсю моц загаварылі аб нацыянальнай трагедыі.

Першая мастацкая выстаўка "Чарнобыль. Чорная быль" экспанавалася ў снежні 1987 г. у Рэспубліканскім доме работнікаў мастацтваў, другая — у студзені 1988 г. у Палацы мастацтваў Беларусі. Гэта былі выстаўкі-справаздачы мастакоў У.Кожуха, В.Шкарубы, В.Барабанцава, А.Фралянкова, М.Цудзіка, якія на працягу васьмі дзён у маі 1987 г. працавалі ў чарнобыльскай зоне, сустракаліся



Репозиторий БГУКИ

з людзьмі, эвакуіраванымі з зоны адчужэння, з ліквідатарамі вынікаў катастрофы. Яны зрабілі дзесяткі натурных замалёвак, эцюдаў, накідаў. Выставы мелі на мэце дапамагчы людзям асэнсаваць чарнобыльскую трагедыю. Яны у пэўнай ступені мелі дакументальны, рэпартажны характар. Але усё, што паказалі мастакі, было праўдай, было прасякнута трагічным подыхам падзей. У іх творах адлюстраваліся злавесныя перамены, што пачаліся ў прыродзе і ў сядзібах, пакінутых людзьмі. Гэта былі першае папярэджанне пра жудасную небяспеку і заклік да пошукаў выйсця з бяды. У межах свайго вопыту і майстэрства мастакі карысталіся ўсімі ўласцівымі ім сродкамі, каб данесці да людзей сэнс убачанага. Ужо пасля выставы 1988 г. творцы пачалі фарміраваць мастацкую галерэю ў Брагіне, на мяжы адчужанай зямлі. Кожны з іх падараваў для галерэі па пяць карцін. У гэты ж перыяд да чарнобыльскай тэмы пачалі далучацца іншыя творцы.

Народны мастак Беларусі Г.Ваııчанка стварыў серыю палотнаў: "Радыяцыя", "Зорка Палын", "Чарнобыльскія яблыкі", "Апраменьванне", "Зона стронцыю", "Чорная быль". У кожным з гэтых твораў — бязмерная трывога і пакутны боль, быццам боль самой зямлі, якая шукае і не можа знайсці паратунку. Да гледача мастак звяртаецца з філасофскім асэнсаваннем трагічнасці падзеі. Ён пераходзіць да абагульненняў, да раскрыцця вечнай праблемы — барацьбы святла і цемры, дабра і зла.

Народны мастак Беларусі М.Савіцкі стварыў цыкл палотнаў "Чорная быль": "Крыж падзей", "Эвакуацыя", "Плач аб зямлі", "Рэквіем", "Відушчы", "Настальгія", "Пакінутыя", "Чарнобыльская мадонна", "Доля", "Забароненая зона", якія экспанаваліся ў Рэспубліканскай мастацкай галерэі, залах Беларускай дзяржаўнай філармоніі і ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь да дзевятай гадавіны катастрофы. Па сіле ўздзеяння іх можна параўнаць з ваенным цыклам мастака "Лічбы на сэрцы". Непасрэднасць адлюстравання чарнобыльскай бяды гучыць і ў жывапісных творах В.Шматава з серыі



Рэпазіторый БГУКІ

“Чарнобыльская трагедыя”: “Лёс”, “Пакінутая хатка”, “Палессе”, “Дарога”, “Маці”, у творах У.Гардзеенкі — трыпціх “Дваццаты адрэзак часу”, дыпціх “Смутак аб загінуўшым краі”. У лістападзе 1989 г. адбылася рэспубліканская выстаўка “Мастак і экалогія”, якая закранула і праблемы чарнобыльскай бяды.

Наогул,на кожнай мастацкай выставе 90-х гадоў былі творы аб Чарнобылі. Гэта палотны жывапісцаў А.Марачкіна, У.Уродніча, П.Скрыпнічэнкі, В.Альшэўскага, І.Бархаткова, А.Фралянкова, Я.Цімохава, М.Казакевіча, Р.Ландарскага, С.Давідовіча; графічныя лісты Г.Паплаўскага, В.Баранава, В.Гладкевіча, У.Мехавіча, В.Славука, П.Драчова, М.Будавея, У.Васюка, скульптараў А.Фінскага, А.Шатэрніка, І.Засімовіча, А.Купрыянава, А.Вараб’ёва і інш. Своеасаблівa адлюстравана тэма Чарнобыля ў габеленах В.Дзёмкінай “Чорная быліна”, “Крыніца часу”, “Зорка Палын”. Гэтыя і іншыя творы мастакоў наводзілі на роздум аб тым, што чалавек павінен адчуць сябе залежнай часцінкай асяроддзя, адзінай прыступкай у бясконцай лесвіцы эвалюцыі, што праблема адносін да прыроды — найперш праблема маральная, праблема духоўнай культуры. Сродкамі мастацтва творцы імкнуліся вярнуць чалавеку святло яго душы.

Чарнобыльская праблема распрацоўвалася таксама мастакамі, якія жылі ў забруджаных рэгіёнах. Адметныя творы на гэтую тэму ёсць у мастакоў з Гомельшчыны Р.Сафронава, Р.Ландарскага. Іх палотны “Беларусы — Чарнобыль — быль”, “Дзень смутку” неаднаразова экспанаваліся на выставах і вернісажах. Жывапісны твор П.Печанькова “Дамоклава ластаўка”, прысвечаны чарнобыльскай трагедыі, выклікаў асаблівую цікавасць гледачоў, якія наведалі Магілёўскую выставачную залу. На выставе, якая адбылася ў 1990 г., было паказана звыш 300 работ 91 аўтара. Побач з творамі, якія выклікалі настрой асаблівай тугі і трывогі за родны край, было шмат лірычных пейзажных замалёвак. У выбары сюжэтаў відаць любоў да родных мясцін.

Репозиторий БГУКИ

Неабходна адзначыць, што ў першай палове 90-х гадоў у абласных і раённых гарадах мастакамі Беларусі стваралася шмат карцінных галерэй, выстаў, на якіх экспанаваліся палотны беларускіх, украінскіх, расійскіх, японскіх творцаў. Так, у 1993 г. у Чачэрску выстаўляліся карціны японскага мастака Хірасі Каіхары, у якіх адлюстравалася чарнобыльская тэма. У 1993 г. у зале Гомельскага абласнога аддзялення Саюза мастакоў Беларусі адбылася выстава авангарднай скульптуры амерыканца Джона Вайдэмана. У тым жа годзе ў Магілёўскім абласным мастацкім музеі была арганізавана цікавая выстава "Графіка нямецкага экспрэсіянізму", якую падрыхтаваў Інстытут замежных сувязей г. Штутгарта. "Рускі жывапіс другой паловы XX ст." — так называлася выстава з 33 жывапісных твораў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, што была разгорнута ў 1994 г. у музеі В.К. Бялыніцкага-Бірулі.

У 1991 г. у зале Гомельскага абласнога аддзялення Саюза мастакоў была арганізавана выстава "Чарнобыль перасцерагае". У 1992 г. у Касцюковіцкім раённым краязнаўчым музеі працавала выстава твораў беларускіх мастакоў, сярод якіх было палатно В.Ф. Шматава "Дарога ў зону". Сорак карцін перадалі ў падарунак жыхарам вёскі Ціхінічы на Гомельшчыне маскоўскія мастакі ў 1993 г. У пасёлку Акцябрскі ў 1991 г. адкрылася раённая карцінная галерэя, аснову якой склаў дарунак загадчыка аддзела выяўленчага мастацтва Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Л.М. Дробава. 35 яго палотнаў разам з іншымі творамі мастакоў Гомельшчыны размясціліся ў трох прасторных выставачных залах. У залах Горацкай карціннай галерэі, якая была створана ў 1991 г., толькі ў 1994 г. арганізаваны выставы "Партрэты першаасветнікаў зямлі беларускай" і персанальная — твораў С. Квача.

Працэс стварэння карцінных галерэй, арганізацыі выстаў на тэрыторыі, якая найбольш пацярпела ад чарнобыльскай трагедыі, працягваецца. Так, у 1998 г. адбылося адкрыццё карціннай галерэі ў будынку былога

Репозиторий БГУКИ

Пінскага калегіума, у фондах якой — 730 графічных кампазіцый і 440 твораў жывапісу.

Творчасць мясцовых мастакоў вызначаецца багаццем накірункаў, стыляў, жанраў і жанравых разнавіднасцей, адсутнасцю стылістычных канонаў, выразнай акрэсленасцю індывідуальных, аўтарскіх асаблівасцей. У маладым беларускім мастацтве адраджаецца незалежная рэалістычная традыцыя. Яна добра выяўляецца ў творчасці Л.Журавовіч з Бялыніч. Карціны яе, сінкрэтычна звязаныя, натхнёныя любоўю да родных мясцін, паказваюць хараство зямлі ў ясных і даходлівых рэалістычных формах. Бацькі, знаёмыя, людзі працы — галоўныя персанажы яе палотнаў. Прыгажосць навакольных краявідаў адлюстравана ў творах С. Квача з Магілёўшчыны. Палотны "Лясная дарога", "Цямнее", "Лета канчаецца", "Пасля снегу", "Ускраіна", "Поўдзень" выклікаюць шчымлівае пачуццё.

У розных карцінных галерэях Гомельшчыны выстаўляліся творы мясцовых мастакоў Д.Алейніка, М.Казакевіча, С.Курашова, А.Крымава, Р.Ландарскага, А.Пятрова, В.Рыкаліна, А.Отчыка, В.Ягорава і інш. Магіляўчане былі добра знаёмыя з мастацкімі творамі С.Грыцына, Т.Куканавай, Л.Папуцьевай, Н.Гасінай, І.Полевай, М.Максімава, Д.Пухоўскага, М.Цітова, якія ўваходзілі ў аб'яднанне "8+". Філасофскім роздумам над учарашнім і сённяшнім адметныя палотны бабруйскіх мастакоў У.Рубцова, А.Концубы, Ю.Нікіфарава, Т.Вялюгі. Эмацыянальна пададзены ў творах гомельскага мастака А.Сушкова глыбокі дысананс паміж трагізмам паслячарнобыльскага існавання і ўсеўладдзем жыцця. Шырока вядомыя пейзажныя работы У.Лосева і М.Казакевіча.

Гамяльчане добра знаёмыя з творамі Р.Спірыдонава па розных экспазіцыях, яго працы ёсць у зборах калекцыянераў ЗША, Канады, Аўстрыі і іншых краін. Работы Р. Спірыдонава ўражваюць не толькі тонкім адчуваннем і разуменнем пароды дрэва, але і здольнасцю мастака падкрэсліць у карціне менавіта той матэрыял, які патрэбен для цэласнага твора.

Рэпазіторый БГУКИ

Да дзесяцігоддзя трагедыі, вясной 1996 г., у Магілёве, Гомелі і іншых гарадах посткатастрофнага соцыуму былі арганізаваны выставы карцін беларускіх і замежных мастакоў. У Магілёўскай абласной выставачнай зале, напрыклад, былі прадстаўлены творы мастакоў-гамяльчан Ю.Несцерука, М.Максімава, А.Ціткова, У.Пахоўцава, К.Аляксеева і інш. Звыш 50 карцін з чарнобыльскага цыкла "Зона адсялення" расійскага мастака К.Папова экспанаваліся ў Гомелі.

Аналіз развіцця выяўленчага мастацтва 90-х гадоў сведчыць: праз іншасказальнасць, абвостранасць уласнага бачання трагедыі Чарнобыля творцы імкнуліся паказаць патаемнае і найбольш істотнае ў экалагічнай праблеме. Нясцерпны смутак адчуваецца ў палотнах многіх мастакоў. Напісаныя ў востраэксцэнтрычнай і метафарычнай манеры, яны паказваюць пачуцці трывогі за сучаснае чалавецтва, беспрытульнасці і адзіноты чалавека, яго безабароннасці перад стыхіяй тэхнакратызму. Мастакі імкнуцца да заглыбленага зместу карцін, раскрыцця праз канкрэтны матыў побыту пацярпелага насельніцтва агульначалавечых заканамернасцей жыцця.

Вывучэнне артыкулаў, матэрыялаў сродкаў масавай інфармацыі паказвае, што паміж унутраным светам мастака і гледача не існуе мяжы, глядач выступае суразмоўцай, суперажывае трагедыі. У краявідах, нацюрмортах, замалёўках мастакоў адчуваецца жывая туга па скалечанай прыродзе, па мілых воку сельскіх мясцінах, дзе адпачываеш душой. Іх творы поўныя задуменнасці і назіральнасці. Яны настройваюць гледача на ўспрыманне прыроды ва ўсёй яе прыгажосці і непаўторнасці. Сузіранне элегічна-задуменных, прамяніста-радасных і рамантычна-таямнічых краявідаў дапамагае забыцца на бяду, пранікнуцца пачуццём замілавання да роднай прыроды, вярнуць страчаныя каштоўнасці.